# Школьны веснік



Выпуск 2

Кастрычнік,2016

## ДЗЕНЬ МАЦІ



*Ты паслухай, як сэрца матулі гамоніць-*
*Ці крынічкай у лузе, ці званочкам у полі...*
*Зазірні ў яе вочы, найлепшыя ў свеце-*
*Незабудак блакіт, што квітнее ў леце;*
*Птушанём у пяшчоту яе акуніся,*
*Дабрыні і журбоце яе пакланіся,*
*І малітвам яе, хваляваннем спавітым,*
*Смачным стравам у ранні, рукам працавітым...*
*Зацвіце яна яркай півоняю мая*
*І ўсмешкаю сонца на вуснах зайграе,*
*Ты адчуеш, як сэрца матулі спявае.*

*Падзякаваць трэба той матчынай песні,*
*Што ў калысцы ты слухаў не раз,*
*І з вуснаў яе, трапяткіх і гарачых*
*Заўсёды злятаў мілагучны той сказ.*

*І маці спявала ласкава і шчыра,*
*Каб буры было табе не чуваць,*
*У поцемках штосьці хуценька шыла,*
*Святло не запальвала, каб не спыняць*

*Салодкія сны дзіцяці малога,*
*Яскравыя, светлыя, ясныя сны.*
*І з песень матуліных родная мова*
*Цяплом адбівалася ў дзіцячай душы.*

*Падзякаваць трэба той матчынай песні,*
*З якой пачынаецца наша жыццё,*
*Жыццё роднай мовы ў маленечкім сэрцы,*
*Што стала вялікім, як свет, пачуццём.*

***Алена Лянок***

Матуля, мілая, родная, любімая! Я ад шчырага сэрца хачу павіншаваць цябе з цудоўным святам, Днём маці. Хачу сказаць, што ты — самая добрая, самая мудрая, пяшчотная, прыгожая мама ў свеце. Я цябе вельмі моцна люблю за тое, што ты менавіта такая, якая ёсць, ганаруся і радуюся тваімі поспехамі. Я бясконца ўдзячна за ўсё, што ты зрабіла і робіш для мяне. Прабач за ўсе , чым я, можа калі, цябе пакрыўдзіла, хочацца, каб ў далейшым усе было толькі добра. Жадаю табе, каб ты ніколі не хварэла, каб поспех быў тваім пастаянным спадарожнікам, каб ты не хваляваліся па дробязях, а тваё добрае сэрца заўсёды заставалася такім жа чулым.



Вечнай, мамулечка, табе маладосці, неўвядальнай прыгажосці і толькі добразычлівага акружэння. Цалую цябе і абдымаю. ***Твая дачушка Іна.***



***Лепшае слова***
***На цэлай планеце—***
***Мама!***
***Рады ёй дзеці***
***На ўсім белым свеце.***
***Мама!***
***Колькі ласкі,***
***Цяпла і дабрыні***
***Дорыць нам мама—***
***Самы лепшы і дарагі***
***Чалавек на зямлі.***

***Сын Сяргей***



Як мама, ніхто цябе
так не ласкае,
Як мама, ніхто цябе
так не чакае,
Як мама, ніхто не
жадае шчасця такога,
Бо мама—чалавек, які
дадзены Богам.

***Дачушка***



*Хто нам прыйдзе на*
*падмогу?*
*Хто падасць*
*сняданне?*
*Хто падскажа, як*
*патрэбна*
*Выканаць заданне?*
*Хто нас любіць і*
*галубіць,*
*Хто не спіць начамі,*
*Калі што-небудзь не*
*так*
*Здарылася з намі?*
*Кожны ведае адказ*
*Дарослыя і дзеці.*
*Мама ў цябе і ў нас*
*Ёсць адна на свеце.*

***Дачка Насця і сыны***



*Цеплынёй атуліць*
*Сонейка зямлю.*
*Мілая матуля,*
*Я цябе люблю.*
*Мне з табой утульна,*
*І спяваю я:*
*"Мамачка,*
*Матуля,*
*Любая мая".*

***Сын Павел***






Я слаўлю мамы
светлае імя –
Пяшчотнае, нібыта
яблынь квецень.
Матулінага сэрца
цеплыня
Нас саграваe лепш за
ўсё на свеце.

*Любімы сын*



Матуля, я віншую цябе з Днём маці! Бяссонныя ночы, перажыванні-гэта для цябе хутчэй норма, чым выключэнне. Ты за мяне хвалюешся душой і сэрцам. Заставайся такой жа добрай, мудрай, разумнай. Я цябе вельмі люблю. Няма ў свеце чалавека мілейшага, я вельмі ўдзячна табе за тое, што мама робіш для мяне. Са святам цябе, МАМУЛЕЧКА!

***Дачка Паліна***



Светлы месяц у акне.
Ноч прыціхла над зямлёю.
Толькі мама не засне
З думай доўгаю сваёю.

Мама размалявала жыццё яркімі, вясёлкавымі фарбамі. Узгадайце, колькі шчаслівых дзён падарыла! Калі б не яна, дзяцінства не было б такім светлым і поўным сонечнага цяпла. Нават калі мамы далёка, яны ўсё роўна бліжэй за ўсіх: адчуваюць нас, усе нашы трывогі і мары.




Мамы заўсёды гатовыя аддаць апошняе і працаваць не пакладаючы рук толькі для таго, каб мы адчувалі сябе ўпэўнена.

Я віншую сваю любую **маму** са святам.

***Сын Стасік***

В мире нет родней улыбки,
И добрее сердца нет.
Наша связь не угасает,
Сколько б не минуло  лет.
Я сегодня пожелаю:
Мама будь всегда сомной.
Будь здоровой и счастливой,
Вечно молодой душой.
Дочь Диана



Мая маці – гэта той чалавек, які мяне любіць і паважае. Акрамя яе ў мяне  няма больш дарагога чалавека ва ўсім свеце. Яна ў мяне прыгажуня. У маёй матулі  вочы, якія свецяцца, як дзве зорачкі,цёмныя валасы, тонкія бровы. Прыгожыя губы, белы твар, на якім заўсёды ззяе ўсмешка. Яна вельмі добрая, прыгожая, шчырая. Мама заўсёды дапаможа ў цяжкую хвіліну. Ёй я магу даверыць усе свае сакрэты. Яна ўсё сваё жыццё даглядае ўсіх у  сям'і і дае мне усё, што  сама ўмее і ведае. Няма на свеце дабрэйшай за цябе – мая матуля.

***Дзіяна***



***Мама!***
***Мамачка!***
***Матуля!***
***Я твой***
***вобраз ў***
***сэрцы тулю.***

***Па жыцці пад час нягодаў***
***Ты дарадчык мой заўсёды.***
***Твая  Ксюша***



*Наша мама– самы дарагі для нас чалавек на свеце. Для нас яна самая прыгожая , самая разумная, самая мудрая. Яна можа даць адказ на любое наша пытанне. М ы вельмі любім сваю маму.*

*Я слаўлю мамы светлае імя –*
*Пяшчотнае, нібыта яблынь квецень.*
*Матулінага сэрца цеплыня*
*Нас саграваe лепш за ўсё на свеце.*

*Я слаўлю мамы светлую душу,*
*Якая разумее нас з паўслова.*
*Я толькі маму памагчы прашу,*
*Калі жыццё паставіцца сурова.*
*Сын  Аляксандр*

*Самая цудоўная і пяшчотнае слова на зямлі – Мама. Гэта першае слова, якое вымаўляе чалавек.*

*Мама для мяне самы дарагі на свеце чалавек. Як мая мама, ніхто так не ўмее любіць, ніхто не можа так горка тужыць, не ўмее так цярпець і ахвяраваць сабой. У маёй мамы самыя добрыя і пяшчотныя рукі. Яны ўмеюць усё. У маёй мамы вернае і чулае сэрца, у якім ніколі не тухне любоў да родных і сяброў. Мая мама, вясёлая ці журботная, заўсёды застаецца для мяне добрай і любімай. Без мамы немагчыма ўявіць родную хату. З ёй можна падзяліцца і горам, і радасцю. Мая мама клапатлівая, пяшчотная, бескарыслівая, самаахвярная. І я адчуваю сябе ўпэўненай у жыцці разам з ёй.*



*Мар'яна*